# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 3 (825) | Пятніца, 24 студзеня 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

## МІНІСТР АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

16 студзеня на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь міністрам адукацыі зацверджаны ГАЙСЁНАК Віктар Анатольевіч.

Новаму міністру — 41 год. Нарадзіўся ў сям'і рабочага. Беларус. Скончыў Белдзяржуніверсітэт, дзе і прайшоў усе службовыя прыступкі ад асістэнта кафедры да дэкана фізічнага факультэта. У 1988—91 гг. працаваў сакратаром парткома універсітэта. Апошні час — загадчыкам кафедры методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі.

Доктар навук, прафесар. Жанаты. Мае дачку.

## АБМЯРКУЕ ВУЧОНЫ САВЕТ

30 студзеня ў кабінеце рэктара адбудзецца чарговае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Па дакладу прарэктара па навуковай рабоце прафесара А. М. Сердзюкова будуць падведзены вынікі навукова-даследчай работы і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў за 1991 год і абмеркаваны задачы ў гэтай сферы дзейнасці на 1992 год.

Нагадаем, што летась у верасні на пасяджэнні вучонага савета разглядалася пытанне аб рабоце кафедр грамадскіх навук. Тады было вырашана зноў вярнуцца да яго пасля першага вучэбнага семестра. У наступны чацвер канчаткова вырашацца пытанні далейшага лёсу дзейнасці кафедр грамадскіх навук.

Па інфармацыі прафесара У. В. Анічэнкі запланавана абмеркаваць і зацвердзіць Палажэнне аб лінгвістычнай навукова-даследчай лабараторыі.

Дэканы біялагічнага і геалагічнага факультэтаў В. Я. Верамейчык і А. П. Пінчук праінфармуюць аб рабоце базы практык у Чонках.

Па конкурсу на вакантныя пасады адбудуцца выбары прафесарска-выкладчыцкага саставу.

## АБКОМ АБЖЫВАЮЦЬ СТУДЭНТЫ

Зноў пачаў функцыяніраваць будынак былога Гомельскага абкома КПБ. Пасля зацяжной спрэчкі аб яго далейшым лёсе дэпутаты абласнога Савета вырашылі перадаць яго медыкам. На адным з паверхаў размясціўся абласны аддзел аховы здароўя, астатнія шэсць «абжываюць» студэнты самай маладой у горадзе вышэйшай навучальнай установы — медыцынскага інстытута.

(БЕЛТА).

*Фотарэпартаж*

## СЕСІЯ — НА ФІНІШЫ

Завяршаецца зімовая залікова-экзаменацыйная сесія ў студэнтаў дзённага аддзялення. Як вытрымана выпрабаванне ведамі? Канчатковыя вынікі будуць падведзены пазней, і аб іх мы раскажам на старонках нашай газеты ў адным з наступных нумароў. Пакуль жа хвалюючае напружанне экзаменаў —на здымках нашага фотакарэспандэнта У. ЧЫСЦІКА.





Экзамен па метэаралогіі ў другакурснікаў геалагічнага факультэта прымала асістэнт кафедры геаграфіі Н. М. Яцэнка (на здымку злева). Добрыя веды на ім паказала Ірына Дударава.

Вышэйшым балам ацаніў веды студэнткі гр. Ф-23 фізічнага факультэта Н. Васільевай на экзамене па дыферэнцыяльных інтэгральных ураўненнях і варыяцыйнаму вылічэнню прафесар Р. В. Шаймуратаў.





Студэнты гр. М-41 матэматычнага факультэта здавалі экзамен па педагогіцы. Пасля напісання імі пісьмовай работы прафесар І. Ф. Харламаў падводзіць іх вынікі.



Дзе ж ён, самы лёгкі білет?

## ХРОНІКА

З 1-га студзеня ва універсітэце створана новая служба — планава-фінансавы аддзел, які размесціцца ў п. 1-15 галоўнага корпуса. Яго ўзначаліла **Святлана Яўгеваўна ПАШУК**, працаваўшая раней намеснікам начальніка навукова-даследчага сектара. Першае інтэрв'ю з ёй аб новых акладах і стаўках для прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў чытайце на другой старонцы сённяшняга нумара нашай газеты.

• • •

Загадам па універсітэту выконваючай абавязкі дэкана эканамічнага факультэта назначана загадчыца кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю дацэнт **Тамара Васільеўна КАРПЕИ**.

## ДАКТАРОЎ НАВУК ПРЫБАВІЛАСЯ

**Восенню мінулага года дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства Раіса Міхайлаўна Казлова паспяхова абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Нядаўна на яе адрас была даслана паштоўка, у якой паведамлялася аб прысуджэнні ёй Прэзідыумам ВАКа гэтай вучонай ступені.**

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат і ўвесь калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта горача віншуюць Раісу Міхайлаўну са знамянальнай у яе жыцці падзеяй і жадаюць ёй новых поспехаў у навукова-педагагічнай дзейнасці.**

# ЯК НАМ ВЫЖЫЦЬ?

**Талоны, купоны, візітныя карткі, «драўляныя», «інвалідныя» замест інвалютных, рублі, на якія мала што можна купіць з-за шалёных цэн... З такім вось «багажом» мы крочым да рынку. Але пакуль да яго дойдзем, і як нам абяцаюць, зажывём як цывілізаваныя людзі, зараз усім нам патрэбны сацыяльныя гарантыі. Асабліва цяжка цяпер тым, хто працуе ва ўстановах і арганізацыях, якія фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту. У іх ліку — і вышэйшая школа. Як абаронены выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты нашага універсітэта ва ўмовах лібералізацыі цэн?**




На гэта пытанне на старонках нашай газеты даюць адказ:

**Н. І. КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў:**

— З мэтай выканання пастановы Савета Міністраў Дзяржаўны камітэт па працы і сацыяльнай абароне і Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь пастанавілі: увесці з 1 студзеня 1992 г. новыя размеры дзяржаўных стыпендый.

У вышэйшых навучальных установах паспяваючым студэнтам яна ўстанаўліваецца ў размеры 280 рублёў у месяц, у тым ліку маючым толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 320 рублёў, а толькі выдатныя — 360 рублёў у месяц;

Студэнтам, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з рашэннем урада на поўным дзяржаўным забеспячэнні, устанаўліваецца стыпендыя ў размеры 115 руб. у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі — 155 руб. у месяц, а толькі выдатныя адзнакі — 195 руб. у месяц;

студэнтам з ліку воінаў-інтэрнацыяналістаў — у размеры 345 руб. у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі —385 руб., а толькі выдатныя адзнакі — 425 руб. у месяц, з іх знаходзячымся на дзяржаўным забеспячэнні адпаведна — 215, 255 і 295 руб. у месяц;

студэнтам, якія вучацца па спецыяльнасцях «Матэматыка», «Прыкладная матэматыка», «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм», у размеры 350 руб. у месяц, незалежна ад курса навучання, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, —390 руб., а толькі выдатныя адзнакі — 430 руб. у месяц;

студэнтам за асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці можа ўстанаўлівацца персанальная стыпендыя савета ВНУ ў размеры 350 руб. у месяц;

навучэнцы падрыхтоўчых аддзяленняў атрымліваюць стыпендыю ў размеры 195 руб. у месяц;

імянныя стыпендыі ўсіх відаў — 480 руб. у месяц.

У нас ва універсітэце нямала студэнцкіх сем'яў. Таму, канешне, іх цікавяць размеры дзяржаўных дапамог на дзяцей. З 1 студзеня г. г. уведзены новыя размеры дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Так, адзінаразовая дапамога (700 руб.) выплачваецца пры нараджэнні дзіцяці (у выпадку нараджэння двух або больш дзяцей дапамога выплачваецца на кожнае дзіця). Таксама адначасовую дапамогу ў размеры 350 руб. выплачваюць жанчыне, нарадзіўшай дзіця, і якая стала на ўлік у жаночай кансультацыі да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці. Штомесячныя дапамогі: 420 руб. — маці, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду за дзіцём да дасягнення ім 3-х-гадовага ўзросту. У выпадку, калі маці перапыняе водпуск па догляду за дзіцём ва ўзросце ад 1,5 да 3 гадоў, або афармляе дзіця ў дашкольную дзіцячую ўстанову, дапамога выплачваецца ў размеры 210 руб.

Жанчыны, якія знаходзяцца ў водпуску па догляду за дзіцём і адначасова працягваюць вучобу ў ВНУ, атрымліваюць стыпендыю і дапамогу ў поўным размеры.

210 рублёў — такая дапамога сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў. Адзінокія маці будуць атрымліваць штомесячную дапамогу ў размеры 525 руб. — на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў і 265 руб. — на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў.

Просьба да ўсіх студэнтаў, якія маюць дзяцей, прайсці перарэгістрацыю ў прафкоме студэнтаў да 1 сакавіка г. г.

Усе віды матэрыяльных дапамог забяспечваюцца купонамі ў 100% размеры.

**С. Я. ПАШУК,**
**начальнік планава-фінансавага аддзела:**

— Перш за ўсё скажу аб пасадавых акладах для прафесарска-выкладчыцкага саставу. У адпаведнасці з загадам Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь за № 7 ад 15 студзеня на падставе пастановы Дзяржкамітэта Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва ад 6 студзеня 1992 г. яны ўстаноўлены ў наступных размерах:

—для загадчыка кафедры— прафесара з вучонай ступенню доктара навук — 2300, без вучонай ступені доктара навук— 2100 руб.;

— для прафесара з вучонай ступенню доктара навук — 2100, без вучонай ступені доктара навук — 1990 руб.;

— для дацэнта з вучонай ступенню — 1670, без вучонай ступені — 1510 руб.;

— для старшага выкладчыка з вучонай ступенню — 1510, без вучонай ступені — 1370 руб.;

— для асістэнта, выкладчыка з вучонай ступенню — 1250, без вучонай ступені — 1130 руб.; для выкладчыка-стажора — 1020 руб.;

Для асоб, якія маюць ганаровае званне «народны», аклад павышаецца на 200 руб., «заслужаны» — 160 руб.

Аклады прафесараў і дацэнтаў устанаўліваюцца асобам, якія маюць вучонае званне адпаведна прафесара або дацэнта (старшага навуковага супрацоўніка).

Асобам з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу, якія назначаны на пасады прафесараў і дацэнтаў, але не маюць адпаведнага вучонага звання, пасадавыя аклады прафесара або дацэнта з улікам наяўнасці вучонай ступені доктара або кандыдата навук устанаўліваюцца на тэрмін да двух гадоў.

Асобы з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу, якія не маюць вучонага звання прафесара, за загадванне кафедрай будуць мець даплату ў размеры 150 рублёў у месяц.

На пасады выкладчыкаў-стажораў залічваюцца на тэрмін да двух гадоў спецыялісты, якія маюць вопыт педагагічнай работы не менш 5 гадоў. Спецыялістам жа без пяцігадовага працоўнага стажу пасадавы аклад устанаўліваецца на 10% ніжэй прадугледжанага для выкладчыка-стажора.

**— Якія пасадавыя аклады ўстаноўлены для кіруючых работнікаў?**

— Калі канкрэтна гаварыць пра наш універсітэт, то яны такія: рэктару — 2800 руб., першаму прарэктару, прарэктару па вучэбнай рабоце — 2560 руб.; прарэктару па навуковай рабоце — 2400 руб., іншым прарэктарам — дацэнтам або кандыдатам навук — 2000 руб., прарэктару па АГР — 1670 руб. Аклад галоўнага бухгалтара — 1670, дэкана:— прафесара або доктара навук— 2300, дацэнта або кандыдата навук — 2100; начальнікаў аддзелаў — вучэбнага, кадраў, аспірантуры — 1150, загадчыка аддзела тэхнічных сродкаў навучання, галоўных энергетыка і механіка — 1130.

Аклады старшых лабарантаў з вышэйшай адукацыяй і лабарантаў, якія ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, адпаведна 860 і 640 руб. Стаўка камендантаў — 660 руб., прыбіральшчыц, дворнікаў, швейцараў — 430 руб.

**— Што можна сказаць пра аклады і стаўкі іншых катэгорый работнікаў?**

— Такая ўжо наша сістэма, што без няўвязак не абыходзіцца. Вось і цяпер прыкладна на 25—30% работнікаў універсітэта новая заработная плата нам яшчэ невядомая. Для высвятлення яе трымаем сувязь з адпаведнымі органамі. Пакуль што не можам весці размову аб персанальных надбаўках. Усё гэта справа будучыні.

**— Якая аплата працы для пагадзіншчыкаў?**

— Для тых, хто працуе са студэнтамі, за адну гадзіну яна ўстаноўлена ў наступным размеры: прафесарам, дактарам навук — 30, дацэнтам, кандыдатам навук —25, асобам без вучоных ступеняў — 20 руб., з аспірантамі — адпаведна 45, 40, 35 руб.

**28** СТУДЗЕНЯ на пасяджэнні пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і гістарычнай спадчыне гарадскога Савета народных дэпутатаў будуць разгледжаны

## ПРАПАНОВЫ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ

Яны распрацаваны прафкомам выкладчыкаў і супрацоўнікаў і прафкомам студэнтаў:

— Для студэнтаў вырашыць пытанне аб ільготных умовах харчавання і праезду ў дзяржаўным транспарце, а таксама забеспячэння іх таварамі першай неабходнасці па дзяржаўных цэнах.

— Прадугледзець дадатковае фінансаванне на выплату студэнтам, якія пражываюць на прыватных кватэрах, кампенсацыі ў размеры не ніжэй 50 руб. у месяц.

— Увесці гарадскі каэфіцыент (1,5) для аплаты працы выкладчыкаў.

— Разгледзець пытанне аб выдзяленні ў гарадскім бюджэце артыкула на развіццё універсітэта.

— Забяспечыць штогадовае выкананне рашэння гарвыканкома аб выдзяленні жыллёвай плошчы універсітэту і ліквідаваць запазычанасць за мінулыя гады (1987—88 г. г. — запазычанасць 400 м²).

— Лічыць аб'екты будаўніцтва універсітэта (вучэбна-спартыўны комплекс, корпус для гуманітарных факультэтаў, жылы дом для выкладчыкаў ВНУ горада) часткай праграмы ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС.

— Выдзеліць участкі пад індывідуальнае будаўніцтва, неабходную пазыку на льготных умовах.

— Штогод выдзяляць аўтатранспарт у асабістае карыстанне выкладчыкам і супрацоўнікам (5 машын у год).

*Аб галоснасці*

# НЕ РАБІЦЬ САКРЭТАЎ

Недахопу на інфармацыю аб тым, што адбываецца сёння ў сферы палітыкі і эканомікі як у нашай рэспубліцы, так і ў іншых краінах СНД мы цяпер не адчуваем. З перадач радыё, тэлебачання, са старонак шматлікіх перыядычных, свабодных, незалежных выданняў, якімі перапоўнены кіёскі «Саюздруку», мы даведваемся аб усіх падзеях, што адбываюцца вакол нас і ў свеце наогул.

А вось неабходную аператыўную інфармацыю аб навінах у нашым універсітэце выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты, на жаль, могуць атрымаць не заўсёды своечасова. Шматтыражная газета «Гомельскі універсітэт» імкнецца ў поўнай меры выконваць ускладзеную на яе функцыю — усебаковага асвятлення жыцця ГДУ. Аднак яе перыядычнасць (раз у тыдзень) іншы раз не дазваляе нам, яе супрацоўнікам, аператыўна, па самых свежых слядах расказаць аб тым, цікавасць да чаго ў калектыве універсітэта бывае асабліва павышанай. Вось самы свежы таму прыклад. У сувязі з пераходам да рынку, лібералізацыяй цэн работнікам вышэйшай школы, як і ўсім астатнім катэгорыям працоўных нашай рэспублікі, былі павышаны размеры пасадавых і службовых акладаў. Аднак усе, хто прыходзіў у дзень выдачы авансу да акенца касы, былі ў поўнай невядомасці, якая ж у іх цяпер зарплата. Зразумела, што даць тлумачэнне кожнаму асабіста наконт яе новых размераў работнікі бухгалтэрыі не мелі магчымасці, ды ў гэтым і не было патрэбы. Проста адміністрацыя універсітэта слаба выкарыстоўвае такую дадатковую крыніцу інфармаванасці членаў калектыву як Дошкі аб'яў, якія ёсць у кожным корпусе. А шкада. Калі б людзі знаходзіліся ў курсе спраў, у іх не ўзнікалі б лішнія пытанні і ўсемагчымыя домыслы.

# КАНІКУЛЫ, КАНІКУЛЫ...

Гэта самая жаданая, доўгачаканая пара для кожнага студэнта. Ні табе лекцый, практычных, канспектаў! Увесь свой час можна прысвяціць любімым справам. Нехта любіць спакойна правесці два зімовыя тыдні дома, ад'есціся на хатніх харчах, бо ў наш галодны час з талонамі і купонамі не надта пажыруеш не тое што на студэнцкую стыпендыю, а нават і на больш-менш салідны заробак. Іншым жа студэнтам пасля двух-трох дзён дамашняй утульнасці хочацца добрага неспакою — цікавых уражанняў, новых сустрэч, знаёмстваў.

А іх могуць прынесці турыстычныя паездкі на час канікулаў па пуцёўках, якія прадаставіў жадаючым прафком студэнтаў універсітэта. Яшчэ восенню мінулага года іх набыта каля 500 шт. па цэнах, якія ў адрозненне ад авія- і чыгуначных білетаў, «не кусаюцца». Дамы адпачынку, санаторыі нашай рэспублікі, г. Ялта, Гурзуф, Геленджык, Феадосія — вось адрасы курортных і турыстычных цэнтраў Паўднёвага берага Крыма, куды збіраюцца на аздараўленне і адпачынак многія студэнты ГДУ.

(Наш кар.).

# АДДЗЕЛ ІНТЭРНАТАЎ ІНФАРМУЕ

Месц у інтэрнатах універсітэта, як вядома, на ўсіх студэнтаў не хапае. Многія вымушаны жыць на прыватных кватэрах, што, канешне, не зусім зручна ды і грашовыя расходы ад гэтага павялічваюцца. Таму ўпаўне зразумела жаданне такіх студэнтаў стаць жыхарамі агульнага студэнцкага дома. А вось некаторыя з тых, хто імі з'яўляюцца, на жаль, добра не ўсведамляюць сабе, што неабходна захоўваць правілы пражывання ў інтэрнаце, бо ў адваротным выпадку можна апынуцца за яго сцянамі, і тады мусіш шукаць сабе прытулак у іншым месцы. Так, напрыклад, здарылася са студэнтам IV курса фізічнага факультэта В. Плышэўскім. За парушэнне правілаў пражывання ён выселены з інтэрната № 1.

Такія крайнія меры, на якія мы вымушаны ісці, няхай паслужаць урокам для тых студэнтаў, якія не задумваюцца аб сваіх паводзінах у інтэрнаце, а значыць і не даражаць займаемым у ім месцам. Прэтэндэнтаў жа на кожнае свабоднае месца хапае.

У сувязі з пераводам на завочны факультэт і ўходам у акадэмічны водпуск у інтэрнатах ГДУ вызваліліся месцы для пражывання студэнтаў дзённай формы навучання наступных факультэтаў:

эканамічны — 1 (жаночае), 1 (мужчынскае);
матэматычны — 3 (жан.), 3 (муж.);
фізічнай культуры — 3 (муж.), 2 (жан.);
фізічны — 1 (муж.);
філалагічны — 2 (жан.);
гістарычны — 2 (муж.).

Па пытаннях засялення звяртацца ў аддзел інтэрнатаў (галоўны корпус, п. 1-19, тэл. 56-57-73).

**В. ГАПЕЕЎ,**
**загадчык аддзела інтэрнатаў.**



ЗІМНІ ПАРК.

*Спазнай сябе*

# ПАРАДОКСЫ СТОМЛЕНАСЦІ

**У Старажытнай Грэцыі лічылі, што ў залатым веку людзі не ведалі ні клопатаў, ні гора, ні стомленасці. Калі ж тытан Праметэй украў для людзей нябесны агонь і навучыў іх рамёствам, то разлаваў багоў. У пакаранне яны паслалі на Зямлю цяжар працы — стомленасць і хваробы.**

Гэта ўсяго толькі міф. А як жа на самой справе: стомленасць — здароўе або хвароба? Доўгі час вучоныя лічылі стомленасць адмоўнай з'явай, нейкім прамежкавым станам паміж здароўем і хваробай. Нямецкі фізіёлаг М. Рубнер у пачатку XX ст. выказаў гіпотэзу, што чалавеку адпушчана на жыццё пэўная колькасць калорый. Паколькі стомленасць «з'ядае» энергію, то гэта вядзе да скарачэння жыцця. Атрымліваецца, трэба менш стамляцца і больш адпачываць? Некаторыя вучоныя нават выдзелілі з крыві «таксіны стомленасці», якія скарачаюць жыццё. Аднак жыццё не пацвердзіла гэту гіпотэзу. Не выпадкова, Абломаў памёр ад бяздзейнасці. Тым не менш да гэтага часу асобныя людзі ўсяляк берагуць сілы ў спадзяванні аддаліць стомленасць і старасць.

Даследаванні паказалі, што стомленасць з'яўляецца натуральным узбуджальнікам працэсаў аднаўлення працаздольнасці. Тут дзейнічае закон біялагічнай зваротнай сувязі. Калі пазбавіць арганізм стомы, то будуць зніжацца і аднаўленчыя працэсы, а таксама тонус нярвовай сістэмы. Чым больш стомленасць (да пэўнай мяжы), тым больш моцная стымуляцыя аднаўлення і вышэй узровень наступнай працаздольнасці. Важна і тое, што ў перыяд аднаўлення адбываецца «бягучы рамонт» органаў і тканак, узмацняюцца працэсы рэгенерацыі, зажыўлення ран і г. д. Вось чаму стомленасць не разбурае арганізм, а стварае яго. Больш таго, устаноўлена, што фізічныя нагрузкі не скарачаюць, а, наадварот, павялічваюць працягласць жыцця.

Такім чынам, ваш тонус залежыць ад ступені стомленасці. Хочаце быць бадзёрымі — стамляйцеся!

Але чаму ж у такім выпадку мы ўспрымаем стомленасць як непрыемнае пачуццё: пагаршаецца настрой, баліць цела і г. д.?

Прыхільнікі эмацыянальнай тэорыі лічаць, што справа — у зніжэнні цікавасці да работы, суме ад яе. Іншыя асновай стомленасці лічылі канфлікт паміж нежаданнем працаваць і прымусам да працы. Цяпер найбольш даказанай лічыцца дзейная тэорыя. Яна заснавана на ўстаноўчай мадэлі паводзін, згодна якой у чалавека фарміруецца гатоўнасць да дзеяння або ўстаноўкі на працу. Успомніце, хіба вы не адчувалі стомленасці, калі знаходзіліся ў парыве творчасці? А як цікава і нестамляльна бывае ў інстытуце на першых лекцыях! Станоўчая ўстаноўка на фізічныя практыкаванні дае не стомленасць, а мышачную радасць. Устаноўка псіхалагічна падтрымлівае тонус арганізма на належным узроўні. Калі яна згасае, то і ўзнікае непрыемнае пачуццё стомленасці. Значыць, толькі ад вас залежыць адчуванне стомленасці як хваравітай з'явы або як задавальнення. Умеюць жа спартсмены, турысты і проста вопытныя фізкультурнікі ўспрымаць стомленасць як мышачную радасць. Аказваецца, калі стомленасць становіцца прывычнай, то ўключаюцца дадатковыя рэзервы тонусу арганізма і фарміруюць адчуванне лёгкасці, пад'ёму сіл, творчага настрою.

**(З кнігі «Сакрэты вашай бадзёрасці»).**

*Вясёлы перапынак*

# МАЛАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

● **ПРАКТЫКА** (працяглая) — шматразовая перадача аднаго і таго ж экзамена.

● **ПРЫМАДОНА** — сакратарка дэкана.

● **ПРАФЕСАР** — гэта студэнт, які здаў ўсе!!! (Заўвага рэд.) экзамены.

● **РАБОТА** — універсальнае панящце. Па-студэнцку гучыць так: «Без работы цяжка, але мы цяжкасцей не баімся!»

● **РАСКЛАД** — гэта рэч, пры складанні якой ніхто не клапоціцца ні пра студэнта, ні выкладчыка, а толькі аб аўдыторыі.

● **РАЗГУБЛЕНАСЦЬ** — вышэйшая ступень сканцэнтраванасці.

● **РАЦЫЯНАЛІСТ** — студэнт, які нават у лужу стараецца ўпасці як мага зручней.

● **РЭФЕРАТ** — спісаны які-небудзь даклад (або артыкул) і прыпаднесены студэнтам у якасці ўласнага.

● **РЫЗЫКА** — дабрачынная справа, калі ты не рызыкуеш.

● **РАБІНЗОН** — студэнт, які праходзіць практыку ў Паратунку (што паблізу Петрапаўлаўска-Камчацкага).

● **РУБЕЛЬ** — грашовая адзінка: адзін рубель — дробязь, некалькі рублёў — стыпендыя, шмат рублёў — зарплата кааператара або рэктара.

● **СВАБОДА** — пачуццё пасля паспяхова здадзенага экзамена.

● **СЕМЕСТР** — сумны працяг часу паміж канікуламі.

● **СЕМІНАР** — а) студэнцкая гульня па наступных правілах: гуляючыя назначаюць выступаючых, тыя не прыходзяць; калі ў каго-небудзь спытаеш што-небудзь, той нічога не ведае, г. зн. прайграў; б) варыянт для дарослых дзіцячай гульні «Маўчанка»: хто першым прагаворыцца, таму «два» (г. зн. «нездав.» — Заўв. рэд.).

● **СЕСІЯ** — а) «Тысяча кніг і адна ноч»; б) цікавая гульня, калі адны ўсе ведаюць і маўчаць, а іншыя нічога не ведаюць і гавораць; в) гэта маленькі адрэзак часу перад канікуламі, калі студэнты знаёмяцца з выкладчыкамі, вывучаемымі дысцыплінамі і будучай спецыяльнасцю.

● **СІМУЛЯНТ** — выкладчык, які стараецца пазбавіцца ад студэнтаў са словамі: «Няма больш сіл вас пытаць».

● **СТАРАСТА** (студэнцкай групы) — «слуга двух гаспадароў».

● **СТЫПЕНДЫЯ** — аплата за жах у час экзаменаў. У наша дні — гэта залішняя дабаўка да субсідый «продкаў».

● **СТУДЭНТ** — гэта чалавек, які два разы ў год памірае, але часцей, як Фенікс, паспяхова адраджаецца.

● **СУФЛІРАВАЦЬ** (падказваць) — перадача думак на адлегласці.

● **ШЧАСЦЕ** — калі раніцай хочацца ісці на лекцыі, а пасля іх — дадому.

● **УЛАСНАЯ ДУМКА** — гэта самая кароткая адлегласць паміж дзвюма цытатамі.

**(«Студенческий меридиан», № 5, 1991 г.).**


## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
— эканамічнай інфарматыкі і аўтаматызаваных сістэм кіравання — загадчыка; дацэнта — 1;
— матэматычных праблем кіравання — дацэнта.
— англійскай мовы — выкладчыка;
— палітэканоміі — дацэнта (2).

Тэрмін падачы заяў — не пазней аднаго месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 106.

**РЭКТАРАТ.**



## У ЦЫРКУ — НОВАЯ ПРАГРАМА

**Толькі 40 дзён, з 31 студзеня 1992 года — новая цыркавая праграма «Арэны яркі круг». У праграме — ілюзія з птушкамі Наталлі і Аляксея Панарыных, лятаючыя эквілібрысты пад кіраўніцтвам Аляксандра Бондара, дрэсура сабак пад кіраўніцтвам Кацярыны Рубанавай і іншыя цікавыя нумары.**

**У паўзах — клоунская група пад кіраўніцтвам Валерыя Колабава.**

**У касах цырка з 10.00 да 20.00 адкрыты папярэдні продаж білетаў.**

**Даведкі — па тэлефоне 55-13-53.**



**Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны,**
**Спонсар газеты — студэнцкі саюз ГДУ.**

**Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Беларусі па друку, г. Гомель, Савецкая, 1.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Аб'ём 1 друк. арк.**

**Тыраж 1.500 экз. Заказ 21.**

**Падпісана да друку ў 14.00.**